**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2019 г.

## <u>Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага сцяга РБ</u>

**3 мая**

Вядучыя гадзіны ваеннай гісторыі «В жарком пламени грозной войны» расказалі навучэнцам гімназіі аб злачынствах фашыстаў у канцлагерах, у тым ліку супраць дзяцей, аб тым, што адбывалася з мірнымі жыхарамі, якія трапілі ў канцэнтрацыйныя лагеры. Праз прадстаўленую відэапрэзентацыю «Яны прыкрылі свет сабой» прысутныя змаглі акунуцца ў гісторыю тых трагічных падзей.

ЦРБ, 51 чал.

**8 мая**

У рамках праекта «Хобі-цэнтр 55 +» ў клубе «Універсітэт залатога ўзросту» прайшоў вечар памяці «И помнит мир спасенный». Мерапрыемства суправаджалася музычнымі нумарамі ваеннай тэматыкі ў выкананні ўдзельнікаў клуба.

ЦРБ, 46 чал.

**9 мая**

Лукская публічная інтэграваная бібліятэка сумесна з Домам культуры правялі традыцыйнае ўрачыстае шэсце калоны Бессмяротнага палка вёскі Лука. Бібліятэкар арганізавала афармленне транспарантаў з фотаздымкамі землякоў-франтавікоў - ураджэнцаў вёскі Лука. Удзельнікі мерапрыемства прайшлі па галоўнай вуліцы вёскі і прынялі ўдзел у мітынгу-рэквіеме «Паклонімся вялікім тым гадам». Другой часткай мерапрыемства стала выступленне ЛПГ «Застаўся ў сэрцы вечны след вайны», на якой прагучаў расказ пра паэтаў і пісьменнікаў, якія ў ваенныя гады прайшлі цяжкімі франтавымі дарогамі да Перамогі. Прысутныя праслухалі вершы і песні аб вайне і агляд кніжнай выставы «Рэха вайны і памяць сэрца».

Лукская ПБ, 80 чал.

**9 мая**

На выступленне ЛПГ «Крыніца» «Подзвігу ляжыць дарога ў вечнасць» сабраліся жыхары вёскі Залессе. Увазе прысутных прадэманстравана тэатралізаваная пастаноўка «Альбом памяці», бібліяграфічны агляд кніжнай выставы «Вайна. Перамога. Памяць». У выкананні ўдзельнікаў літаратурна-паэтычнай групы прагучалі вершы і песні, прысвечаныя тэме міру. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй «Ты же выжил, солдат!».

Залеская ПБ, 180 чал.

**16 мая**

У час пасяджэння аматарскага клуба «Светлячок» прайшоў патрыятычны ўрок «Герб, сцяг, гімн. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі

Беларусь». Бібліятэкар расказала аб галоўных сімвалах нашай краіны, аб гісторыі іх узнікнення, значэнні сімволікі ў жыцці кожнага чалавека і краіны ў цэлым. Хлопчыкі і дзяўчынкі актыўна ўдзельнічалі ў гульні «Складзі прымаўку», віктарыне «Символы моей страны», адказвалі на шэраг пытанняў віктарыны, прысвечанай гісторыі дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь.

Дзіцячы філіял, 38 чал.

## Мерапрыемствы да Дня сям'і

**12 мая**

На пасяджэнне клуба «Крыніца» «Семейное чтение сближает поколения» бібліятэкары запрасілі сем'і, чые дзеці з'яўляюцца актыўнымі чытачамі. Прысутныя спаборнічалі ў конкурсах і інтэлектуальных гульнях, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны, складалі прыказкі з прапанаваных варыянтаў слоў і спрабавалі сябе ў акцёрскіх ролях пры чытанні казкі «Рэпка на новы лад». Пераможцамі конкурснай праграмы сталі сем'і Грушкевіч і Матвеюк. Завяршылася мерапрыемства святочным чаяпіццем.

Гарадзецкі філіял, 27 чал.

**15 мая**

Гасцямі тэматычнай гадзіны «Мая сям'я - мая радасць» сталі навучэнцы першага курса Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Бібліятэкары расказалі прысутным пра гісторыю ўзнікнення свята, пра галоўныя сямейныя каштоўнасці, аб святых заступніках сям'і. На сустрэчы прысутнічала медработнік Кобрынскай ЦРБ Цярэнцьева Н. І., якая акцэнтавала ўвагу, што рэпрадуктыўнае здароўе - гэта найважнейшы складальнік агульнага здароўя чалавека, кожнай сям'і і грамадства ў цэлым.

ЦРБ, 35 чал.

**17 мая**

На сямейным падарожжы «Приходите к нам в дом», арганізаванным бібліятэкарам, гледачы апладысментамі сустракалі сем'і-канкурсанты на сцэне Дома культуры. Удзельнікі адказвалі на пытанні віктарыны «І жартам, і сур'ёзна», удзельнічалі ў конкурсе «Вуснамі дзіцяці», стваралі дом сваёй мары, дзеці тлумачылі прыказкі пра сям'ю. Дадаткам да мерапрыемства стала прэзентацыя аб самых незвычайных дамах свету, прытча пра шчаслівую сям'ю і фотакалаж «Венец всех ценностей семья» з сямейнымі фатаграфіямі. Пераможцамі конкурснай праграмы сталі сем'і Канавальчук і Альшэўскія.

Навасёлкаўская ПБ, 55 чал.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага дня без тытуню

**29 мая**

У бібліятэцы адбылося пасяджэнне аматарскага клуба, гадзіна здароўя «Курэнне - фактар рызыкі хранічных неінфекцыйных захворванняў». Вядучыя расказалі дзецям аб самым небяспечным рэчыве ў тытуні -

тытунёвым дзёгці і пра патрэбу фарміравання адмоўнага стаўлення да тытунекурэнню. Работнік ФАПа Якаўчыц Г. П. расказала аб курэнні як фактары рызыкі хранічных неінфекцыйных захворванняў у фактах і лічбах. Прысутныя прагледзелі відэафільм «Паляванне за розумам». Завяршылася мерапрыемства аглядам кніжнай выставы «Не акажыся ў палоне тытунёвага дыму».

Шамятоўская ПБ, 29 чал.

**30 мая**

Для навучэнцаў Лукскай СШ адбыўся ўрок здароўя «Курыць не модна, дыхай свабодна». Прысутныя праслухалі інфармацыю пра сітуацыю па Брэсцкай вобласці ў фактах і лічбах, пра шкодны ўплыў тытуню і спайсаў на арганізм, адказалі на пытанні тэматычнай віктарыны, прагледзелі відэапрэзентацыю «Курение или здоровье – всё в ваших руках!». Усім дзецям бібліятэкар раздала буклеты «Аб шкодзе курэння».

Лукская ПБ, 27 чал.

**31 мая**

Гасцямі гадзіны перасцярогі «Опасность тлеющего огня» сталі навучэнцы старэйшых класаў СШ № 6. Падлеткі даведаліся аб праблеме курэння і згубным уплыве розных кампанентаў тытуню і тытунёвага дыму на арганізм чалавека, ацанілі шкоду электронных цыгарэт і адказалі на пытанні віктарыны «Небяспечнае захапленне». Аб захворваннях, звязанных з курэннем расказала прысутным урач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ С. С. Васільева. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Курэнне – траўля арганізма».

ЦРБ, 35 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**10 мая**

Для навучэнцаў старэйшых класаў гімназіі адбылася гадзіна прафарыентацыі «Выбар прафесіі - выбар будучыні». Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным, на што варта звярнуць увагу пры выбары будучай прафесіі, правялі інфарм-дайджэсты «Топ-7 прафесій будучыні ў Беларусі», «Карысныя і шкодныя для здароўя прафесіі», «Новыя і модныя прафесіі». Праведзена бяседа аб прафесіі бібліятэкара. Старшакласнікі адказалі на пытанні профі-віктарыны, падабралі прафесіі ў гульні «Самая-самая», папрактыкаваліся ў конкурсае «Ён - яна». Увазе моладзі прадстаўлена відэапрэзентацыя «Свет прафесій: дарогі, якія мы выбіраем».

ЦРБ, 39 чал.

**16 мая**

Чарговае пасяджэнне аматарскага клуба «Экоша» прайшло ў форме квэст-гульні «Книги читай и природу защищай!». У гульні прынялі ўдзел 2 каманды. Яны атрымалі «Подорожную карту путешественника», якая дапамагала не збіцца са шляху. Дзеці пабывалі ў «Пещере паука», «Теремке Знаний», прайшліся па «Зелёной лужайке», наведалі «Дом феи Экологии», «Страну Легумию», сабралі 5 слоў, з якіх склалі выказванне пра прыроду.

Арэхаўская ПБ, 24 чал.

**31 мая**

На свята чытацкіх задавальненняў біблятэкар запрасіла вучняў малодшых і сярэдніх класаў Балоцкай БШ. Юныя ўдзельнікі паспрабавалі сябе ў рэкламе любімых кніг падчас акцыі «Читайте и удивляйтесь», прагледзелі лялечны спектакль «Петрушка и капризка» і падзяліліся сваімі планамі на летнія вакацыі. Завяршылася мерапрыемства на пляцоўцы каля клуба гульнямі, конкурсамі і спартыўнымі спаборніцтвамі.

Балоцкая ПБ, 44 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81